

КНІГА СУПРАЦЬ ГАДЖЭТА: ХТО КАГО?

ЧЫРВОНКА

«ДЗЕЦІ НЁМАНА» — НАЙЛЕПШЫЯ НА ВЫЕЗДЗЕ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 119 (28986)

## ЛІЧБА ДНЯ

**Br380 млн**

*(70 % у агульным аб'ёме фінансавання) склалі на сённяшні дзень дадатковыя інвестыцыі ў развіццё інфраструктуры Беларусі пад эгідай II Еўрапейскіх гульняў, паведамілі ў Мінфіне. За кошт бюджэтных сродкаў правялі мадэрнізацыю, рамонт і абсталяванне 12 найбуйнейшых спартыўных аб'ектаў, а таксама спартыўных збудаванняў і інтэрнатаў Студэнцкай вёскі. Набыта сучаснае спартыўнае, медыцынскае і тэлевізійнае абсталяванне для іншых аб'ектаў бюджэтнай сферы, а таксама транспартныя сродкі, якія па заканчэнні мерапрыемства будуць перададзены ў распараджэнне арганізацый бюджэтнага сектара, значна ўмацаваўшы іх матэрыяльна-тэхнічную базу.*

# «ЗАЛАТЫ» СТАРТ НА ВАДЗЕ

## Марына ЛІТВІНЧУК і Вольга ХУДЗЕНКА сталі чэмпіёнкамі II Еўрапейскіх гульняў



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Учора на вяслярным канале ў Заслаўі працягнуліся спаборніцтвы па веславанні на байдарках і каноэ. Там прайшлі фінальныя і паўфінальныя заезды, нашы спартсмены былі заяўлены ў пяці вырашальных стартах.**

СТАР. 3

## КОРАТКА

• Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены сёння ў Беларусі з-за навальніц і граду.

• **Пайшла з жыцця вядомы дзяржаўны дзеяч Беларусі Ніна Мазай.**



• Беларускую мяжу перасеклі 230 тысяч іншаземцаў за 15 дзён бязвізу для балельшчыкаў II Еўрапейскіх гульняў.

• **Сто балаў на ЦТ па грамадазнаўстве атрымалі 15 чалавек.**

• Расійскі ўрад падоўжыў дзеянне прадуктовага эмбарга да канца 2020 года.

• **Дырэкцыя «Славянскага базару» правядзе суперакцыю «1 + 1 + 1 = 4»: па продажы білетаў на ўсе праекты мерапрыемства.**

ISSN 1990 - 763X

Парламенцкі дзённік

## АРМІЯ ЗАМЕСТ «АДПРАЦОЎКІ»

### Атрымаць тры вышэйшыя адукацыі, каб толькі «адкасіць», больш не атрымаецца

**Узброеныя Сілы — ужо не «рухавік адукацыі»: у Палаце прадстаўнікоў у першым чытанні разгледзелі змяненні закона аб пытаннях эфектыўнага функцыянавання ваеннай арганізацыі дзяржавы. Законапраект прадставіў міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ. Ён паведаміў, што ў Беларусі не прызываецца больш катэгорый грамадзян, чым у іншых дзяржавах з абавязковым прызывам.**

«Надышоў час, калі трэба падтрымаць прапановы сілавых структур, бо яны наўпрост звязаныя з бяспекай краіны», — упэўнены Андрэй Раўкоў.

На думку **члена Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігара МАРТЫНАВА**, законапраект не ўносіць сур'ёзных змен ва ўжо існуючы парадак прызыву.

«Усе, хто сёлета заканчвае школы, атрымаюць адтэрміноўку для паступлення ў сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Для атрымання далейшай адукацыі неабходна адслужыць ва Узброеных Сілах. Грамадзянін можа паступіць, узяць акадэмічны водпуск, потым працягнуць вучобу», — растлумачыў дэпутат. Ён адзначыў, што грамадзянін, які не служыў на законных падставах, цалкам мае права працаваць на дзяржслужбе ці служыць у іншых сілавых структурах.

СТАР. 2

Інавацыі

## МЕДЫЦЫНА БУДУЧЫНІ

### Як клетачныя тэхналогіі будуць змагацца з неінфекцыйнымі захворваннямі?

**Больш за 500 пацыентаў прайшлі клетачную тэрапію ў нашай краіне за апошнія гады. Клетачныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца беларускімі медыкамі ў траўматалогіі і артапедыі, транспланталогіі, стаматалогіі, неанаталогіі, неўралогіі, анкалогіі: для лячэння дэгенератыўных захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы, бакавога аміятрафічнага склерозу, рассеянага склерозу, сімптаматычнай эпілепсіі, для імунатэрапіі анкалагічных захворванняў. У паловы з пралечаных пацыентаў назіраецца выражаны клінічны эфект, гэта тыя людзі, якім іншыя метады лячэння не дапамаглі. Усяго Міністэрствам аховы здароўя нашай краіны дазволены да прымянення больш як 40 метадаў лячэння з дапамогай клетачнай тэрапіі.**

### Бясцэнныя запасныя часткі

— Медыцына XX і XXI стагоддзяў істотна адрозніваецца: калі раней на парадку дня былі інфекцыйныя захворванні, то сёння галоўнай мішэнню сталі неінфекцыйныя паталогіі, — падкрэслівае **галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па клетачных біятэхналогіях, загадчык аддзела клетачных біятэхналогій РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, доктар медыцынскіх навук, прафесар Міхаіл ПАТАПНЁЎ.** — Мяркуецца, што да 2030 года да 70 % пацыентаў, што звяртаюцца да ўрача, будуць мець неінфекцыйныя захворванні. Гэта звязана з агульным старэннем насельніцтва.

СТАР. 4

# АРМІЯ ЗАМЕСТ «АДПРАЦОЎКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Галоўнае «ноу-хау» — тое, што адтэрміноўка даецца адзін раз. Праблема ўзнікае толькі ў тых, хто збіраецца працягваць на другой ступені сваю адукацыю ці ў магістратуры і далей, а таксама ў тых, хто атрымаў першую вышэйшую адукацыю і збіраецца атрымаць другую. Я абсалютна не бачу тут праблемы», — дадаў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар МАРЗАЛЮК.**

У законапраекце прапанавана таксама выключыць «кантрактнікаў», што праслужылі не менш за тэрмін абавязковай адпрацоўкі, ад вяртання ў бюджэт сродкаў, выдаткаваных на іх падрыхтоўку.

### Кар'ера падчас «дэкрэту»

Дэпутаты ў першым чытанні разгледзелі змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін. Як паведаміў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віталь ШЫЛАЎ,** па большай частцы пашыраюцца сацыяльна-працоўныя правы работнікаў, прадугледжана ўнясенне каля 260 змяненняў і дапаўненняў амаль у 170 артыкулаў Працоўнага кодэкса.

«Даецца магчымасць працаваць поўны дзень ці поўную змену ў водпуску; скасавана ніжняя мяжа ўзросту дзіцяці — тры гады. Маладыя мамы могуць выйсці з «дэкрэту» на работу з працы — дагэтуль такога права не было замацавана», — прывёў прыклады навел дэпутат.

Па яго інфармацыі, пры падзенні аб'ёмаў вытворчасці работадаўцы, згодна з законапраектам, могуць часова пераводзіць работнікаў на іншую работу альбо да іншага наймальніка з захаваннем працоўных адносін.

Новая глава кодэкса рэгулюе ўзаемаадносіны наймальніка і работніка, які дзейнічае на адлегласці, — дыстанцыйную работу. З аднаго боку, наймальніку не давядзецца арганізоўваць рабочае месца, з другога — работнік можа выконваць задачы там, дзе яму зручна, і мець усе гарантыі.

Віталь Шылаў адзначыў, што з работнікам, які не допускае парушэнняў дысцыпліны, кантракт будзе працягвацца на максімальны тэрмін, наступны кантракт — заключацца мінімум на тры гады. На меншы тэрмін патрэбна пісьмовая згода работніка.

Усяго на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання разгледжана 13 законапраектаў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

У цэнтры ўвагі

# Перазагрузка — шанц для глыбінкі

**Што будзе зроблена для таго, каб Полацкі раён і Наваполацк атрымалі паскоранае развіццё? Гэтае пытанне аказалася ў цэнтры ўвагі абласной выканаўчай улады. На Віцебшчыне па прыкладзе Аршанскага раёна правядуць перазагрузку, і тое самае, нагадаем, згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, трэба будзе зрабіць у іншых гарадах і раёнах Беларусі, дзе пражывае больш за 80 тысяч чалавек. Адпаведныя праграмы распрацоўваюцца з разлікам на рэалізацыю ў 2019—2020 гадах.**

Зразумела, што за такі кароткі час значных змен не ажыццявіць. Таму, як падкрэсліў на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама **кіраўнік рэгіёна Мікалай ШАРСНЁЎ,** трэба «намацаць пульс» праблем, каб выпрацаваць правільную стратэгію развіцця і пачаць рэалізацыю маштабных рэформ з самага важнага.

Галоўная мэта — зрабіць умовы жыцця прывабнымі для тутэйшых і выпускнікоў ВНУ, якія прыедуць у рэгіён па размеркаванні. Камфортнае асяроддзе для жыцця і рост дабрабыту — вось чаго павінна дабівацца мясцовая ўлада.

Некаторыя рэчы запланаваць прасцей, бо мадэль ужо рэалізуецца на Аршаншчыне і, каб вывучыць каштоўны вопыт, далёка ехаць не трэба.

Цікава будзе сачыць за ходам перазагрузкі на Полаччыне і ў Наваполацку, бо цэнтр рэгіёна Полацк — калыска гарадоў беларускіх, а нафтаград — адзін з самых маладых гарадоў краіны.

**Мікалай ШАЎЧУК, старшыня Полацкага райвыканкама,** лічыць, што прыярытэтныя кірункі развіцця эканомікі — у мадэрнізацыі і больш эфектыўным выкарыстанні прамысловага, аграрнага і турыстычнага патэнцыялу. Таксама стаўка робіцца на павелічэнне экспарту прадукцыі і актывізацыю прадпрымальніцкай ініцыятывы. Між іншым, каля паловы паступленняў у бюджэт — ад суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

У сацыяльнай сферы сярод іншага плануецца адкрыццё міжраённага цэнтра сасудзістай неўралогіі.

Вялікі патэнцыял у сферы турызму. У раёне значная колькасць аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці. У Дзяржаўным спісе каштоўнасцяў сусветнага значэння — Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква. У раёне восем гасцініц, звыш трыццаці аграсядзіб, дванаццаць домікаў паляўнічых і рыбаловаў. І ўсё больш ахвотных зарабляць на прыёме гасцей і аказваць адпаведныя паслугі землякам.

У комплексным плане каля 250 мерапрыемстваў, 17 раздзелаў. У рамках выканання будзе рэалізавана 90 ключавых інвестыцыйных праектаў у 13 сферах.

Канешне, у першую чаргу жыхароў раёна цікавіць павелічэнне даходаў. Калі летась намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата складала 828,8 рубля, па выніках 2020 года яна запланавана на ўзроўні 1050 рублёў.

Трэба многае зрабіць, каб памяншаўся ўзровень датацый. Сёння па Полаччыне іх каля 15 %.

**Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, старшыня Наваполацкага гарвыканкама,** канстатаваў, што ў комплексным плане паскорана развіцця 16 раздзелаў. Усяго запланавана рэалізаваць каля 150 мерапрыемстваў. Тое, што ў горадзе з насельніцтвам каля 107 тысяч чалавек трэба павялічваць колькасць вытворчасцяў па-за галіной перапрацоўкі нафты, разумеюць. Таму кіраўніцтва зацікаўлена ў стварэнні новых прадпрыемстваў і працоўных месцаў, павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці на існуючых прадпрыемствах іншых галін.

Што да перапрацоўкі «чорнага золата», дык удзельная вага ААТ «Нафтан» у аб'ёмах прамысловай вытворчасці горада — 97 %.

Між іншым, створаны нафтахімічны кластар (удзельнікі: «Нафтан», Полацкі дзяржуніверсітэт і гарвыканкам), вельмі прывабны для інвестараў. Іншаземныя бізнесмены ахвотна ўкладваюць грошы ў вельмі выгадную вытворчасць нафтахімічнай прадукцыі.

Кіраўнік гарвыканкама акцэнтаваў важнасць рэалізацыі мерапрыемстваў у сацыяльнай сферы. У прыватнасці, плануецца адкрыццё цэнтра алергалогіі пры дзіцячай паліклініцы, стварэнне міжраённага цэнтра рэнтгенэндаваскулярнай хірургіі.

На базе палаца дзяцей і моладзі плануецца стварэнне дзіцячага тэхнапарка.

Далейшаму развіццю горада будзе спрыяць будаўніцтва новага маста праз Заходнюю Дзвіну паміж Наваполацкам і Полацкам. Вялікая нагрузка на адзіны існуючы мост прыводзіць да неабходнасці штогод рамантаваць дарожнае палатно.

У маладым горадзе стаіць праблема недахопу трамвайных ліній. Пакуль што іх працягласць 10 кіламетраў, у тым ліку тры па ўскраіне горада і па старых мікрараёнах. Астатнія сем ідуць уздоўж лясного масіву так званай прамысловай зоны — да завода «Палімір». Пры гэтым большая частка людзей працаздольнага ўзросту жыве ў спальных мікрараёнах, дзе няма трамваяў. Дарэчы, развіццё электрычнага транспарту будзе добрым унёскам і для паляпшэння экалагічнай сітуацыі ў горадзе.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама запатрабаваў ад кіраўнікоў мясцовай улады яшчэ раз прааналізаваць планы, каб не ажыццяўляць задуманае дзеля справаздачы, а рэальна паскорыць развіццё тэрыторый. Вельмі важна пры гэтым улічваць патрэбы насельніцтва, вывучаючы іх падчас апытанняў і сустрэч з людзьмі. Тутэйшыя, безумоўна, ведаюць, чаго не хапае ў населеных пунктах, якія праблемы патрабуюць першачарговага вырашэння.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Блізкая ўлада

# ПЫТАННІ ВЫРАШАЮЦЦА Ў МЕЖАХ ЗАКАНАДАЎСТВА

## Нават калі гэта некаму не падабаецца

**На прыём грамадзян, які правёў старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА ў Мядзеле, запісаліся чатыры чалавекі. Але жанчына, якую цікавіла пытанне збору малака ад яе каровы, не з'явілася. Таму кіраўнік цэнтральнага рэгіёна выслухаў заяўнікаў літаральна за паўгадзіны. Пры гэтым ён адзначыў, што мясцовыя ўлады добра працуюць са зваротамі грамадзян і вырашаюць пытанні, што датычацца іх кампетэнцыі.**

Віталь Мінчук звярнуўся з пытаннямі водазабеспячэння і будаўніцтва лініі сувязі. «Помпа не спраўляецца з падачай вады ў дамы, — паскардзіўся заяўнік, — часта здараюцца перабоі. Гэтая праблема хвалюе ўсіх жыхароў вуліцы Халмагорскай».

**Намеснік старшыні Мядзельскага райвыканкама Жанна АПАНОВІЧ** канстатавала, што ў раёне добра ведаюць пра гэтую сітуацыю, трымаюць яе на кантролі. І ў прынцыпе яно ўжо вырашаецца: літаральна ў наступныя два месяцы пачнецца пракладка новых камунікацый і іх закальцоўка. Будзе пабудаваныназіральны пункт, і 120 абанентаў далучаць да сетак водазабеспячэння, пабудаваных летась. Што датычыцца другога пытання, то ў наступным годзе плануецца правесці новую оптавалаконную лінію па дзяржпраграме, запэўнілі прадстаўнікі раённага вузла электрасувязі.

— Глядзіце толькі, каб сеткі вытрымалі, таму што тут ёсць праблемы, — папярэдзіў губернатар.

Часлаў Адамовіч з вёскі Выгалавічы паскардзіўся, што раённыя электрычныя сеткі не выдаюць тэхнічныя ўмовы, каб павялічыць падачу ў дом электраэнергіі, неабходнай для падагрэву вады і ацяплення, — маўляў, не дазваляюць наяўныя магутнасці. Але мужчыну такі адказ здзіўляе: у вёсцы закрыліся дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, пошта, клуб, якія больш не спажываюць электраэнергію.

— Калі вам верыць, што сеткі не вытрымліваюць нагрузкі, то неабходна прымаць рашэнне аб іх замене або мадэрнізацыі, — звярнуўся да прадстаўнікоў электрасетак Анатоль Ісачанка. — Мы павінны расказаць людзям пра дакладны план дзеянняў.

Яніна Іванаўна, Людміла Уладзіміраўна і Павел Уладзіслававіч Гірыны пражываюць у вёсцы Унукі разам у адным доме. Яны хадайнічалі перад губернатарам, каб закрылі праезд праз іх двор. Паміж дзвюма гаспадарчымі пабудовамі праходзіць дарога шырынёй 2,8 метра. Яна стаіць на балансе мясцовай будаўніча-дарожнай арганізацыі. Але Гірыны сцвярджаюць, што гэты праезд належыць ім. Проста пры рэгістрацыі ў 2009 годзе была дапушчана памылка.

— Вы паглядзіце, да якой катэгорыі гэты ўчастак зямлі адносіцца. І калі першапачаткова ён ішоў як непадзельны, то трэба прыняць рашэнне, вярнуць зямлю людзям і ўзаконіць яе. Калі гэта былі землі агульнага карыстання, то выстаўляйце на аўкцыён, няхай выкупляюць. Гэта будзе законна. Прапрацуйце два гэтыя варыянты, — даў Анатоль Ісачанка даручэнне спецыялістам.

— Як паказвае практыка, усе зямельныя пытанні складаныя, неадназначныя і цягнуцца на працягу 10—20 гадоў. Калісьці людзі з нейкіх прычын своечасова не афармілі або няправільна аформілі зямлю. Сёння даводзіцца зноў звяртацца да гэтай тэмы. І мы вырашаем праблемы ў межах дзеючага заканадаўства, падабаецца гэта грамадзянам ці не, — падкрэсліў напрыканцы губернатар.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Ніны Мікалаеўны МАЗАЙ, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання, і выказваюць глыбокія спачуванні яе родным і блізкім.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Лідары G20 абмяркуюць у Осацы пытанні гандлю і экалогіі

Асноўнымі тэмамі маючага адбыцца саміту «дваццаткі», які пройдзе з 28 да 29 чэрвеня ў Осацы, павінны стаць сітуацыя ў глабальнай эканоміцы і гандлі, а таксама пытанні, звязаныя з экалогіяй. Пра гэта паведамілі ў МЗС Японіі. На саміце таксама плануецца закрануць тэму стварэння міжнароднай сістэмы для падаткаабкладання лічбавых карпарацый. Сярод экалагічных праблем ўвага будзе аддадзена ў тым ліку праблемам пластыкавага смецця ў акіяне. Дачка прэзідэнта ЗША Іванка Трамп запрошана ў якасці спецыяльнага госця на мерапрыемства, прысвечанае пашырэнню ролі жанчын у грамадстве, якое пройдзе ў рамках G20. Сярод тэм, якія на ім плануецца абмеркаваць, — прасоўванне адукацыі сярод жанчын і арганізацыя новых рабочых месцаў для іх.

### Вашынгтон прадставіў план па ўрэгуляванні на Блізкім Усходзе

Ініцыятыва, якую на форуме ў Манаме прадставіў памочнік прэзідэнта ЗША, а па сумяшчальніцтве яго зяць — Джарэд Кушнер, прадугледжвае буйныя інвестыцыі ў Палесціну і суседнія краіны, гаворка ідзе пра 50 млрд долараў, паведаміў Euronews. Прапановы коштам 50 млрд долараў, з якіх больш за палову прапануецца на працягу 10 гадоў выдзеліць Палесціне для рэалізацыі праектаў па развіцці інфраструктуры і прамысловасці, палесцінскія лідары адхілілі. Па іх словах, «здзелка стагоддзя» падзяляе пытанні межаў і статусу Усходняга Іерусаліма, што для іх таксама непрымальна. Тым часам па прызыве палесцінскіх груповак працягваюцца пратэсты, у прыватнасці, у Хеўроне маніфестанты палілі фатаграфіі Трампа. Удзельнікі абвінавачваюць ЗША не толькі ў праізраільскай прадузятасці, але і ў спробе подкупу палесцінцаў, з дапамогай грошай прымушаючы тых адмовіцца ад намаганняў па стварэнні незалежнай дзяржавы.

### Анамальная спякота ахапіла Еўропу

Рэкордна спякотнае надвор'е чакаецца ў еўрапейскіх краінах на гэтым тыдні. Па прагнозах метэаролагаў, тэмпература паветра можа дасягнуць 40 градусаў у большасці краін Заходняй Еўропы — ад Іспаніі да Швейцарыі. З пяндзелка моцная спякота ўсталявалася на большай частцы тэрыторыі Францыі і Італіі. Спецыялісты звязваюць пагодную анамалію з парывамі ветру, якія рухаюцца ў бок Еўропы з Сахары.



Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон заклікаў удзяляць асаблівую ўвагу хворым людзям, цяжарным жанчынам, дзецям і пажылым людзям, для якіх анамальная спякота можа стаць асабліва цяжкім выпрабаваннем. Спякота ад 37 да 40 градусаў усталявалася ў паўночнай і цэнтральнай частцы Італіі, у тым ліку ў Рыме, Фларэнцыі, Мілане і Турыне. У сямі італьянскіх гарадах чакаюцца рэкордныя тэмпературы для чэрвеня. Нямецкія метэаролагі папярэджваюць аб рэкорднай спякоце ў Франкфурце. Спякота чакаецца нават у некаторых скандынаўскіх краінах, дзе летнія тэмпературы звычайна вельмі ўмераныя: на поўдні Даніі і Швецыі тэмпература на гэтым тыдні можа дасягнуць 30 градусаў. Эксперты папярэджваюць, што анамальная спякота будзе ахопліваць еўрапейскія краіны ўсё часцей, нават нягледзячы на намаганні па барацьбе з глабальным пацяпленнем. Папярэдні доўгі перыяд анамальнай спякоты ў Еўропе быў зафіксаваны ў 2003 годзе: тады ад хвароб, выкліканых высокай тэмпературай паветра, памерла каля 20 тысяч чалавек.

# «Тут было неверагодна»

## Уладзімір САМСОНАЎ аб сваім выступленні і арганізацыі Гульняў у Беларусі

**Сёння на Еўрапейскіх гульнях у Мінску майстры малой ракеткі ўступаюць у барацьбу ў камандным турніры. У мужчынскай частцы Беларусь прадставяць Уладзімір Самсонаў, Павел Платонаў і Аляксандр Ханін.**

**А напярэдадні ў чвэрцьфінальным паядынку лідар беларускай каманды па настольным тэнісе Уладзімір Самсонаў сустракаўся з немцам Ціма Болем і саступіў яму 1:4. Трэба адзначыць, што на чвэрцьфінальны паядынак беларус атрымаў аднаго з наймацнейшых супернікаў — першую ракетку турніру і шостую ракетку свету. Да гэтага 43-гадовы айчынны тэнісіст перамог прадстаўніка Італіі Ніагала Стаянава — 4:3 і ўзяў верх над расійскім спартсменам Кірылам Скачковым — 4:2.**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Вядома, напэўна, было б прасцей гуляць з кімсьці іншым за выхад у паўфінал, але жараб'ёўка звяла нас з Ціма на гэтай стадыі спаборніцтваў. Вельмі шкада, што я прайграў у чвэрцьфінале, наўрад ці ў мяне будзе яшчэ адзін шанц згуляць такі турнір дома, пры роднай публіцы. Тут было неверагодна, я не памятаю, каб паглядзець на маю гульню прыходзіла столькі балельшчыкаў, — адзначыў Уладзімір Самсонаў.

*Нагадаем, на Еўрапейскіх гульнях у Баку беларус стаў сярэбраным прызёрам, саступіўшы ў вырашальным матчы прадстаўніку Германіі Дзмітрыю Аўчараву.*

— У фінале ў Баку ў мяне былі добрыя шанцы выйграць, я вёў па сэтах — 2:0, але атрымаў толькі сярэбраны медаль. Гэта не такі ўжо і дрэнны вынік. Зараз быццам бы таксама добра гуляў, але саступіў, ды яшчэ і ў сябе дома... Пачуцці зусім іншыя.

*Тэнісіст дадаў, што ў матчы з немцам яму не хапіла крышачку шанцавання.*

— Я спадзяюся, гледачы нацешыліся добрым настольным тэнісам і будуць хадзіць хварэць за нас і далей. Усе разумеюць, наколькі важныя Еўрапейскія гульні, краіна шмат чаго зрабіла для гэтага мерапрыемства, і таму, вядома ж, усе хочуць, каб нашы спартсмены выступілі як мага лепш.

*Адзначым, што калі беларусы ў камандным турніры пройдуць сапернікаў з Румыніі, жараб'ёўка зноў звядзе іх з немцамі, у тым ліку з Ціма Болем.*

— Нам зноў не вельмі пашанцавала з жараб'ёўкай, Германія — відавочна самая моцная каманда на гэтым турніры, — адзначыў Уладзімір Самсонаў.

*Ён падкрэсліў, што задаволены ўмовамі, якія стварылі арганізатары для беларускай каманды, і адзначыў, што многія спартсмены з іншых краін таксама станоўча адзываюцца аб турніры ў Беларусі.*

— Усе задаволеныя, хоць ведаю, што ўсюды, нават на Алімпійскіх гульнях, ёсць нейкія праблемы. З ежай, напрыклад, або з транспартам. Мае сябры з іншых камандаў кажуць, што ў Мінску ім падабаецца. Тут добрыя пакоі ў Вёсцы спартсменаў, добрая ежа, недалёка дабірацца да залы, на стадыёне ў нас усё арганізавана выдатна, не ведаю, як ідуць справы ў іншых відах спорту.

*Напрыканцы лідар зборнай падзяліўся сваімі далейшымі планамі і адзначыў, што мае намер пазмагацца за ліцэнзію на Алімпійскія гульні ў Токіа ў 2020 годзе.*

— Да Алімпіяды засталося крыху больш за год, пакуль я гуляю быццам бы не зусім дрэнна і не асабліва задумваюся аб сваім узросце, таму, вядома, паспрабую адабрацца ў Токіа.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# КРОК ЗА КРОКАМ

## Што адбылося ўчора, і што чакае нас у чарговы дзень Еўрапейскіх гульняў

**У шосты дзень спаборніцтваў спартсмены разыгралі 16 камплектаў узнагарод у пяці відах спорту. Пяць камплектаў разыграна ў веславанні на байдарках і каноэ. Таксама пераможцы вызначыліся ў вольнай барацьбе, настольным тэнісе ў адзіночным разрадзе ў жанчын і мужчын, у стральбе з лука ў індывідуальных дысцыплінах у жанчын — у стральбе з блокавага і класічнага лука і кулявой стральбе. Папярэднія спаборніцтвы прайшлі ў пляжным футболе, бадмінтоне, боксе, а таксама адбыўся паўфінал лёгкаатлетычных спаборніцтваў.**

У стральбе з лука прадстаўніца беларускай каманды Карына Дзёмінская ў чвэрцьфінальным паядынку перамагла ўкраінку Анастасію Паўлаву, але не змагла прайсці ў паўфінал, саступіўшы ў «перастрэлцы» спартсменцы з Галандыі Габрыэле Баяры 5:6. У іншым чвэрцьфінале Карына Казлоўская прайграла італьянскай спартсменцы Лучыле Боары — 2:6.

Спаборніцтвы лучнікаў на арэне САК «Алімпійскі» завершацца сёння. У 1/8 фіналу мужчынскага індывідуальнага турніру па стральбе з класічнага лука сапернікам беларуса Паўла Далідовіча будзе іспанец Даніэль Кастра. Нагадаем, пакуль у актыве беларусаў адна ўзнагарода ў жаночым камандным турніры па стральбе з класічнага лука — «серабро» заваявалі Карына Казлоўская, Ганна Марусава і Карына Дзёмінская.



Фота БелТА.

Беларус Юрый ШЧАРБАЦЭВІЧ узяў «серабро» ў турніры па кулявой стральбе.

Зборная Беларусі па пляжным футболе ўчора ўвечары правяла свой другі паядынак на Гульнях. Гэтым разам сапернікамі гаспадароў сталі футбалісты са Швейцарыі. Нагадаем, наша каманда пераможна стартавала на турніры ў Мінску. У сваім першым матчы папярэдняй групы А беларусы абыгралі румын — 6:1. Сёння наша каманда згуляе з Партугаліяй.

*«Перамагчы ў першай гульні было вельмі важна. Вялікі дзякуй балельшчыкам, якія класна падтрымлівалі нас, —* адзначыў **капітан зборнай Беларусі па пляжным футболе Ігар БРЫШЦЕЛЬ.** *— У ходзе падрыхтоўкі каманды да турніру мы правялі два зборы па 3—4 дні з выхаднымі. Папрацавалі вельмі плённа, набралі добрую форму. Перад камандай стаіць задача — выйграць спаборніцтвы. Але мы ідзём крок за крокам. Пакуль усе думкі аб маючым адбыцца матчы. Партугальцы выйдуць супраць нас гуляць толькі на перамогу».*

Пасля фінішу групавога этапу барацьбу за медалі працягнуць па дзве найлепшыя каманды з квартэтаў. Паўфіналы адбудуцца 28 чэрвеня, а 29 чэрвеня пройдуць матчы за «золата» і «бронзу». Каманды, якія не трапілі ў паўфінал, згуляюць у суцяшальным турніры за 5—8-е месцы. Нагадаем, на І Еўрапейскіх гульнях у Баку пераможцам турніру па пляжным футболе стала зборная Расіі, «серабро» заваявалі італьянцы, «бронзу» — партугальцы.

Сёння адбудуцца спаборніцтвы па пляжным футболе, стральбе, веславанні, спартыўнай гімнастыцы, бадмінтоне, барацьбе і веласіпедным спорце (трэк).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# «ЗАЛАТЫ» СТАРТ НА ВАДЗЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Першае «золата» ў веславанні нашай камандзе прынеслі байдарачніцы Марына Літвінчук і Вольга Худзенка на дыстанцыі 500 метраў. Дзяўчаты пайшлі ў адрыў са стартавых метраў і вельмі хутка апынуліся па-за зонай дасягальнасці для саперніц. Дапоўнілі прызавую тройку на гэтай дыстанцыі прадстаўніцы Венгрыі і Расіі.

На п'едэстале беларускі не змаглі стрымаць слёз радасці.

*«Трыбуны сваім крыкам падганялі нас, —* заўважыла Марына Літвінчук. *— Вашы калегі прыязджалі да нас і бачылі, як старанна мы працавалі: вось як працавалі, такі вынік і паказалі. Але калі стаіш там, на п'едэстале, усё забываецца — і слёзы, і ўсе цяжкасці».*

*«Дзякуй усім родным, блізкім, сябрам, балельшчыкам, трэнерам, —* адзначыла Вольга Худзенка. *— Дзякуй за такую арганізацыю. Да нас падыходзяць замежныя спартсмены і кажуць, што яны ў захапленні ад такой арганізацыі спаборніцтваў».*

Адзначым, што ў бягучым сезоне беларускія байдарачніцы Марына Літвінчук і Вольга Худзенка з'яўляюцца аднымі з лідараў, яны перамаглі ў «двойцы» на 500 м на этапе Кубка свету ў Познані.

Бронзавым прызёрам на дыстанцыі 1000 метраў у байдарачнікаў-адзіночак стаў Алег Юрэня. Яго апярэдзілі толькі венгр Балін Копач і партугалец Фернанда Пімента. *«Вельмі прыемныя эмоцыі, бо я ганяюся ў Мінску і гэты медаль для мяне вельмі важны, —* адзначыў Алег пасля фінішу. *— Важны нават не столькі для мяне, колькі для трыбун, для маіх родных і блізкіх. Ганяцца ў сябе дома ўдвая больш адказна, і ўтрая больш прыемна заваёўваць медалі. Тут мае бацькі, жонка, дачка. На старце я быў вельмі спакойны, але гонка атрымалася цяжкая».*

Адзначым, што ў бягучым сезоне на этапе Кубка свету ў Познані на гэтай дыстанцыі Алег Юрэня заняў другое месца, саступіўшы на фінішы толькі партугальцу Фернанда Піменту.

Беларус Максім Пятроў фінішаваў чацвёртым на дыстанцыі 1000 м на каноэ. На фінішы яго апярэдзілі вопытны нямецкі вясляр Себасцьян Брэндэль (трэцяе месца), расіянін Кірыл Шамшурын (другое месца) і адзін з сусветных лідараў у веславанні на каноэ Томаш Качар з Польшчы.

У спаборніцтвах байдарак-двоек на 1000 метраў беларусы Раман Петрушэнка і Віталь Бялько занялі восьмае месца. У фінальным заездзе каноэ-двоек на 1000 метраў Андрэй Багдановіч і Віталь Асецкі сталі сёмымі.

Сёння фінальныя заезды па веславанні ў Заслаўі працягваюцца. Усяго на Еўрапейскіх гульнях у гэтым відзе спорту за медалі змагаюцца 350 спартсменаў. Нагадаем, чатыры гады таму ў Баку ў беларускай зборнай было пяць медалёў па веславанні. У Мінску перад беларускімі спартсменамі стаіць такая ж задача.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

### Меркаванне

Трохразовы алімпійскі чэмпіён у веславанні на каноэ Себасцьян Брэндэль адзначыў высокі ўзровень правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў. «Канал у Заслаўі — адзін з самых сучасных. Рады, што тут праходзяць такія маштабныя спаборніцтвы. Для весляроў Старога Свету ІІ Еўрапейскія гульні — важны старт, у Мінск прыехалі ўсе наймацнейшыя. Я шмат у якіх месцах выступаў за кар'еру, але Мінск пастараўся арганізаваць усё на высокім узроўні: харчаванне, праезд, элінгі, месца старту — увесь сэрвіс на ўзроўні чэмпіянатаў свету і Алімпіяд». Нагадаем, нямецкі спартсмен заняў учора ў заездзе на 1000 м трэцяе месца, апярэдзіўшы беларуса Максіма Пятрова.

Дайджэст

# Што пішуць пра гульні замежныя СМІ

### «Московский комсомолец» (Расія)

У Мінску-2019 (як і ў Баку, уласна, 4 гады таму) дзюдаісты атрымліваюць адразу дзве ўзнагароды: за Еўрапейскія гульні і за чэмпіянат кантынента. «Вядома, я вельмі шчаслівы, можаце нават не пытацца, — свяціўся чэмпіён Гульняў расіянін Арман Адамян, — паколькі гэта першая перамога на турніры такога ўзроўню сярод дарослых! Да 23 гадоў Еўропу ўжо выйграваў... Напэўна, дапамагло тое, што некаторыя сапернікі мяне дрэнна ведалі і недаацанілі, таму сутычкі даволі хутка выйграваў. Але пры гэтым — усе вельмі моцныя і ўсе бліся. Мінск-2019 — трамплін у Токіа? Можа быць, можа быць... Спадзяваўся па меншай меры на гэта вельмі хочацца!»

### ІТАР-ТАСС (Расія)

Еўрапейскія гульні ў Мінску знаходзяцца ў самым разгары, і пакуль спартсмены змагаюцца за медалі, заўзятары і госці беларускай сталіцы, акрамя спаборніцтваў, атрымліваюць асалоду ад мясцовай кухні. Арганізатары і ўладальнікі ўстаноў прапануюць вельмі шырокі выбар. «Мінск — вельмі прыемны горад з мілымі людзьмі. А кухня тут фантастычная. Дома папрашу жонку рабіць мне дранікі», — прызнаўся ў гутарцы з карэспандэнтам ТАСС француз Клод.

### ESPRITBLEU (Францыя)

Ад ІІ Еўрапейскіх гульняў Мінску застанецца спадчына на карысць горада і яго жыхароў. Напрыклад, горад мадэрнізаваў свае аўтобусны і тралейбусны паркі і распрацаваў інтэграваную сістэму маршрутаў грамадскага транспарту. Такім чынам, у беларускай сталіцы з'явілася больш за 60 электробусаў, якія пасля пяціхвіліннай зарадкі могуць аўтаномна ехаць да 13 кіламетраў. Другая ўзлётна-пасадачная паласа Мінскага нацыянальнага аэрапорта, а таксама дарогі Мінск — Гродна М6 і Мінск — Мікашэвічы Р23 таксама былі палепшаны для гэтых Еўрапейскіх гульняў. А Вёска спартсменаў стане студэнцкім комплексам, які можа змясціць больш за 8000 чалавек і мае, у прыватнасці, 25-павярховы маладзёжны хостэл умяшчальнасцю 1800 месцаў!

# МЕДЫЦЫНА БУДУЧЫНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Выкарыстанне клетачных тэхналогій у медыцыне распачалося ў 70-я гады ХХ стагоддзя з перасадкі касцявога мозгу, — уводзіць у курс справы **дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі, кандыдат медыцынскіх навук Андрэй ГАНЧАРОЎ**. — А 90-я гады азнаменаваліся першымі работамі па прымяненні дэндрытных клетак у анкалогіі. Вельмі актыўна пачаў развівацца і такі кірунак, як выкарыстанне мезенхімальных ствалавых клетак для лячэння самых розных захворванняў. У Беларусі клетачныя тэхналогіі ў медыцыне пачалі актыўна развівацца ў пачатку 90-х гадоў, гэта былі ў большай ступені фундаментальныя даследаванні, накіраваныя на атрыманне клетачнага прадукту, а ў сярэдзіне 2000-х гадоў пачаліся першыя клінічныя выпрабаванні. Сёння навукоўцы з усяго свету робяць стаўку ў тэрапіі на біямедыцынскі клетачны прадукт. Ёсць меркаванне, што менавіта за клетачнай тэрапіяй — будучыня.

Усяго ў чалавечым арганізме налічваецца больш як 200 тыпаў клетак са сваёй спецыялізацыяй. Адны складаюць нашу нервовую сістэму, другія — крывяносную, трэція фарміруюць касцявыя тканкі і гэтак далей. Ствалавыя ж клеткі не маюць ніякай «спецыялізацыі», але яны здольныя ператварацца ў любы тып клетак. І робяць гэта на працягу ўсяго жыцця чалавека ў залежнасці ад патрэб з боку тых ці іншых органаў. Па сутнасці, ствалавыя клеткі — бясцэнныя запасныя часткі, без якіх наш арганізм не змог бы абнаўляцца, вельмі хутка старэў бы і гінуў. Чым старэйшы чалавек, тым меншы ў яго запас ствалавых клетак.

## Эфект у анкалогіі

Мезенхімальныя ствалавыя клеткі маюць ярка выражаныя аднаўляльныя здольнасці, таму больш за палову ўсіх даследаванняў у свеце звязаны з іх выкарыстаннем. Беларускія медыкі і навукоўцы таксама прытрымліваюцца сусветных трэндаў.

Нацыянальная акадэмія навук супрацоўнічае з Міністэрствам аховы здароўя ў галіне выкарыстання клетачных тэхналогій у лячэнні пацыентаў з 2006 года. Пяць гадоў таму на базе Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі адкрыўся навукова-медыцынскі цэнтр «Клетачныя тэхналогіі». У яго структуры — лабараторыя па вытворчасці біямедыцынскіх клетачных прадуктаў і крыябанк ствалавых клетак, сертыфікаваныя па стандартах GMP, а таксама паліклінічная база з аперацыйным блокам, стаматалагічны кабінет, кабінет УГД-дыягностыкі, палаты дзённага знаходжання. Сёння тут гатовы праводзіць лячэнне на платнай аснове.

— Эфектыўнасць мезенхімальных ствалавых клетак агульнапрызнаная. Нядаўна іх пачалі прымяняць пры лячэнні рассеянага склерозу. Дапамагаюць яны і пры менш сур'ёзных захворваннях, у прыватнасці хваробах суставаў, — кажа Міхаіл Патапнёў. — Добрыя вынікі атрыманы пры лячэнні астэаартрыту: адна доза дазваляе знізіць запаленне, значна паменшыць болевы сіндром на паўгода. Зараз сумесна з РНПЦ псіхічнага здароўя рэалізуецца ўнікальны праект па лячэнні сімптаматычнай эпілепсіі з дапамогай ствалавых клетак. У пацыентаў кантрольнай групы зніклі прыпадкі.

Андрэй Ганчароў паведаміў, што нядаўна завяршыліся клінічныя выпрабаванні тэхналогіі лячэння пацыентаў, хворых на рак падстраўнікавай залозы, з выкарыстаннем дэндрытных клетак. Іх роля — распазнаваць усіх ворагаў, якія трапляюць у наш арганізм, перадаваць пра іх дакладную інфармацыю іншым клеткам, якія пасля атрыманага сігналу пачынаюць знішчаць чужынцаў. Задача дэндрытных клетак — стымуляваць імунітэт, прычым не агульны, а спецыфічны, накіраваны на канкрэтны антыген, мішэнь — пухліна.

Рак падстраўнікавай залозы — адно з самых цяжкіх анкалагічных захворванняў з неспрыяльным прагнозам. Клінічныя выпрабаванні праходзілі на базе Мінскага гарадскога клінічнага анкадыспансера. У іх удзельнічалі 26 пацыентаў (у большасці была стадыя IIB, гэта значыць, без аддаленых метастазаў) у асноўнай групе, іх лячылі стандартнымі метадамі па пратаколе плюс выкарыстоўвалі дэндрытныя клеткі. Найлепшыя вынікі ў тых, хто прайшоў тры курсы клетачнай тэрапіі — усе яны жывыя. Памерлі шэсць чалавек. Урачы прагназавалі ім максімум 1,5 месяца, а яны пражылі каля года.

Андрэй Ганчароў заўважыў, што прымяненне дэндрытных клетак на ранніх этапах дае больш выражаны эфект. Аднак іх выкарыстанне апраўдана нават на 4-й стадыі хваробы. Ён прыгадаў выпадак, калі па дапамогу звярнулася пацыентка, у якой большую частку печані займалі метастазы. Прагноз быў усяго на пару месяцаў, але дзякуючы дэндрытным клеткам жанчына пражыла больш чым паўтара года.

Вельмі добрыя вынікі былі атрыманыя і ў лячэнні такімі клеткамі раку малочнай залозы ў пацыентак РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. У жанчын была другая стадыя захворвання — агрэсіўная форма з высокай верагоднасцю рэцыдыву. Пасля клетачнай тэрапіі ў 95 % пацыентак на працягу пяці гадоў захворванне не вярталася.

У РНПЦ «Маці і дзіця» распачалася работа па аўталагічнай клетачнай тэрапіі неданошаных дзяцей, у якіх выяўляюцца прыкметы лёгачнай ці цэрэбральнай недастатковасці (пры такой тэрапіі прымяняюцца ўласныя клеткі). «Мы можам лячыць дзяцей ужо ў першы год іх жыцця: выдзяляем клетачны прадукт у немаўляці, замарожваем яго і, калі праяўляецца якая-небудзь паталогія, пачынаем лячыць гэтымі клеткамі», — растлумачыў Міхаіл Патапнёў.

## 3 інструкцый — у пратаколы

— Але клетачная тэрапія — не панацэя, а дапаўненне да стандартных метадаў лячэння, якое дазваляе палепшыць прагноз, — падкрэслівае Андрэй Ганчароў. — Гэта значыць, што нават калі ў 15—20 працэнтаў пацыентаў, якія пакутуюць на рак падстраўнікавай залозы, мы даможамся добрага выніку, гэта будзе вялікім плюсам. Калі нават у 10 % пацыентаў з аміятрафічным бакавым склерозам будзе добры клінічны эфект, гэта можна лічыць дасягненнем. Клетачныя тэхналогіі паступова пераходзяць у пратаколы лячэння. Пакуль гэты працэс ідзе марудна. Па-першае, гэта нятаннае лячэнне (адна доза клетачнай тэрапіі можа каштаваць ад 350—500 долараў да 2—3 тысяч долараў), па-другое, трэба ствараць інфраструктуру, базу, таму што падрыхтаваць клеткі цалкам у аўтаматызаваным рэжыме пакуль немагчыма. Патрабуюцца аснашчаныя лабараторыі і высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія гэтыя клеткі вырошчваюць. Цяпер у Беларусі дзейнічаюць чатыры акрэдытаваныя лабараторыі, а вось спецыялістаў нідзе спецыяльна не навучаюць. Тым не менш працэс ідзе, і, мяркую, што ўжо праз пяць гадоў многія з метадаў клетачнай тэрапіі, якія сёння выкладзены ў інструкцыях па прымяненні, неабавязковых для выкарыстання, будуць занатаваныя ў абавязковых клінічных пратаколах.

А вось да абяцанняў вярнуць з дапамогай ствалавых клетак маладосць Андрэй Ганчароў ставіцца катэгарычна: «У Расіі пэўны час таму было папулярнае «амаладжэнне» ствалавымі клеткамі. У Беларусі гэтым не займаюцца, інструкцый, якія рэгламентавалі б такое прымяненне ствалавых клетак, няма, і я вельмі спадзяюся, што яны і не з'явяцца. Лічу, што гэта не тая сфера, дзе ствалавыя клеткі можна і трэба выкарыстоўваць...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Минская обл., Минский р-н**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Магазин № 4** | 348,1 кв. м | 600/С-132768 | **Михановичский с/с, д. Бордиловка** |

Составные части и принадлежности: пристройка

**Сведения о земельном участке:** пл. **0,3767** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина № 4 в д. Бордиловка. Ограничения (обременения) прав: охранная зона линии электропередачи до 1000 вольт, пл. 0,0210 га

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 119 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда от 05.06.2019

**Аукцион состоится 09.07.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 08.07.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Белая ромашка», 231792, г. Слоним, ул. Коссовский тракт, 100, тел./факс 801562-6-30-29

**Предмет аукциона**
**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Здание проходной** (здание специализированное иного назначения) | 81 кв. м | 450/С-18991 |
| | **Здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 209,7 кв. м | 450/С-18988 |
| | **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 107 кв. м | 450/С-18989 |
| | **Здание столярного цеха – мастерской** (здание специализированное для бытового обслуживания населения) | 573 кв. м | 450/С-18992 |
| | **Склад (баня)** (здание многофункциональное) | 318 кв. м | 450/С-18993 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,5179 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции

**Начальная цена с НДС 20 % – 90 360,00 бел. руб.**

**Капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Школьная**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 2 | **Здание магазина № 2** (здание специализированное розничной торговли) | 103,8 | 450/С-1974 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,0247 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина

**Обременения: аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by**

**Начальная цена с НДС 20 % – 44 148,00 бел. руб.**

**Капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1**

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 3 | **Столовая** (здание специализированное для общественного питания) | 672,7 кв. м | 450/С-18925 |

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,1316 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1316 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 254 553,06 бел. руб.**

**Условие аукциона:** вовлечь в хозяйственный оборот объект недвижимости с момента заключения договора купли-продажи, а в случае проведения реконструкции (строительство, сноса недвижимого имущества) – в сроки, определенные разработанной проектно-сметной документацией

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 30 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов по лотам №№ 1–3 опубликовано в газете «Звязда» от 11.05.2019 г.

**Аукцион состоится 29.07.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.07.2019 до 17.00 по адресу**: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Антикризисный управляющий ООО «Линж» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) – извещает о проведении 29.07.2019 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Цнянская, 12, пом. 302 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности ООО «Линж» – Частное торговое унитарное предприятие «ЭЙВЕР» размер задолженности – 1491,56 BYN) – первоначальная цена 1491,56 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации до 29.07.2019 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 29.07.2019 г. на р/с ООО «Линж» р/с BY79 MTBK 3012 0001 0933 0006 8974 в ЗАО «МТБанк», BYR, код банка MTBKBY22, УНП 690359410.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: **ООО «БЕЛМЕТАЛЛ»** (УНП 100055010) 220075, г. Минск, пр-т Партизанский, 174, к. 301, тел./факс +375 (17) 344-87-71.

Публичные торги в электронной форме будут проведены **29 июля 2019 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Местонахождение |
|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой самосвал «MAZ 555102 225», 2006 г. в. | 7 200,00 | г. Минск, пр-т Партизанский, 174 |
| 2 | Прицеп бортовой «MAZ 837810 042», 2010 г. в. | 5 640,00 | |
| 3 | Полуприцеп МТМ – 93304 , 1998 г. в. | 2 640,00 | г. Гродно, пер. Победы, 5 |
| 4 | Автопогрузчик 40814, 1992 г. в. | 4 200,00 | |
| 5 | Кран автомобильный КС4561АМ (на шасси КрАЗ-250), 1989 г. в. | 7 800,00 | |
| 6 | Станок деревообрабатывающий БДК-202 | 35 064,00 | г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 18/В |
| 7 | Станок деревообрабатывающий | 252,00 | |
| 8 | Мотобур SHTILL BT 121C | 948,00 | |

Телефон для ознакомления +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 26.07.2019 г. до 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

27 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15866)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Андрэй КОЛАСАЎ:

# «ШЧАСЛІВЫ, БО ЗАЙМАЮСЯ ТЫМ, ШТО ЛЮБЛЮ»



**Сем гадоў таму на адным са зборных канцэртаў звярнула ўвагу на саліста з прыгожым мяккім тэмбрам голасу і абаяльнай усмешкай. Тады ён здаўся вельмі сарамлівым для артыста... І яшчэ запомнілася, з якім захапленнем выканаўца глядзеў на больш вопытных служыцеляў сцэны, нібы здзіўляўся — і я сярод іх.**
**З тых часоў Андрэй Коласаў, безумоўна, змяніўся: пасталеў, стаў адным з самых запатрабаваных спевакоў — канцэрты, мюзіклы... А вось усмешка і паважлівае стаўленне да калег засталіся ранейшымі.**

***— Андрэй, ці былі ў вашай сям'і музыкі? Ці ахвотна вы хадзілі ў музычную школу або зайздросцілі хлапчукам, якія гулялі ў футбол?***

— Мая мама Алена Коласава — сапраўдны музыкант. У родным Гомелі яна вельмі вядомая спявачка і піяністка. Я ж у музычнай школе навучаўся па класе класічнай гітары, але не магу сказаць, што зайздросціў хлопцам, якія гулялі ў двары, бо і сам шмат чым паспяваў займацца. Акрамя музыкі гады два хадзіў у секцыю спартыўнай гімнастыкі, потым былі фехтаванне, веславанне, бокс... Спорт заўсёды быў са мной. І цяпер вельмі дапамагае тая загартоўка. Дарэчы, уменне фехтаваць спатрэбілася ў мюзікле «Казанова».

***— Як атрымалася, што першы дарослы выбар быў зроблены на карысць кухарскай справы?***

— Напэўна, мала хто ў падлеткавым узросце сам свядома выбірае прафесію. Мне шмат што падабалася і было цікава. А з тым крокам дапамог вызначыцца выпадак. Мама з'ехала на працяглыя гастролі, і даводзілася есці ў асноўным кабачкі ў самых розных варыянтах: тут табе і аладкі, і салаты, і тушаныя з мясам. Усё гэта гатавала бабуля, і я зразумеў, што хачу стаць кухарам!

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Даніна пашаны

# КІЛАМЕТРЫ ПАМЯЦІ, ТВАРЫ ПЕРАМОГІ

## «Маладзёжны марафон «75» — наступным пакаленням

**Дарогамі вызвалення Беларусі па маршруце Мінск — Баранавічы — Брэст — Пружаны — Гродна — Ліда — Астравец — Маладзечна — Мінск — Жодзіна — Бягомль — Віцебск — Магілёў — Гомель — Мінская вобласць (Курган Славы) удзельнікі патрыятычнага праекта «Маладзёжны марафон «75» прайшлі з 11 да 19 чэрвеня больш за 2,5 тысячы кіламетраў і сабралі больш за дзве тысячы фатаграфій вызваліцеляў краіны. Мерапрыемства было арганізавана БРСМ сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пры падтрымцы Беларускай чыгункі і іншых зацікаўленых.**

Акрамя ўшанавання ў месцах баявой славы памяці тых, хто заваяваў для нас мірнае неба над галавой, мэтай марафонцаў быў і больш глыбокі пасыл для наступных пакаленняў — стварэнне альбома «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі» і палотнішча «Беларусь памятае!»

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Фота БелТА.

Пад перастук колаў

# ЯНЫ ВЫБРАЛІ ЧЫГУНКУ

## А іх — Міс і Лідарам магістралі

**— Прафесійная дзейнасць павінна прыносіць задавальненне. Калі гэтага няма, нічога не атрымаецца, — упэўненыя пераможцы сёлетняга конкурсу «Міс і Лідар Беларускай чыгункі» інжынер па ахове працы Ганна САВЕНКА і электрамеханік Віталь СІДЗІН з Мінскай дыстанцыі электразабеспячэння УП «Мінскае аддзяленне БЧ».**

### АТМАСФЕРА ВАБІЛА З ДЗЯЦІНСТВА

— Я скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту. Сюды прыйшла год таму па размеркаванні, — расказвае дзяўчына.

— Які ён выдаўся для новаспечанага спецыяліста?

— Было нялёгка, скажу шчыра, але цікава. Самае цяжкае — паглыбіцца ў спецыфіку работы. У маёй справе, напрыклад, ты павінен ведаць усё і адразу! Мора дакументаў і акіян адказнасці! Тэорыя і практыка, як аказалася, — рэчы розныя. Да таго ж ва ўніверсітэце я вучылася на інжынера-энергетыка, таму давялося перабудоўвацца. На ўсё пра ўсё мне спатрэбілася дзесьці паўгода, — згадвае спецыяліст.



Фота з архіва герояў.

Ганна жартуе, што выбару, куды падацца пасля школы, амаль не было:

— Я нарадзілася ў сям'і чыгуначнікаў. Тата — памочнік машыніста, матуля нейкі час працавала выхавальніцай у ведамасным дзіцячым садку. Я з малых гадоў была знаёмая з цягнікамі і тымі, хто іх абслугоўвае. Мяне вабіла ўся гэтая атмасфера.

Дзяўчына прызнаецца, што тата ніколі не адгаворваў яе звязваць сваё жыццё са стальной магістраллю, але папярэджваў: «Чыгунка патрабуе поўнай аддачы».

— Я абсалютна не гуманітарый, — усміхаецца спецыяліст. — Таму, напэўна, і вучыцца ва ўніверсітэце было лёгка. Профільныя прадметы — фізіка, электратэхніка — мне вельмі падабаліся.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
27 06 2019 г.

*Пашыраючы прастору*

# ВЕЧНА МАЛАДЫ «ГАРЫ ПОТЭР»,

## або Ці здолее кніга вытрымаць канкурэнцыю з гаджэтамі?

**«Адысея капітана Блада», «Востраў скарбаў», «Тры мушкецёры», «Граф Монтэ-Крыста», «Два капітаны», «Апошні з магікан», «Айвенга», «Таямнічы востраў», «Вершнік без галавы»... Калісьці гэтымі кнігамі літаральна зачытвалася падрастаючае пакаленне. Але ці стануць іх чытаць сучасныя тынэйджары? А можа быць, у кожнага пакалення павінна быць свая культавая літаратура? Якія кнігі выбірае сёння юны чытач? Ці можна зрабіць чытанне трэндам у падлеткаў? Што значыць умець чытаць? Ці фарміруе школа чытацкую пісьменнасць і чытацкую культуру? Якую ролю ў заахвочванні да чытання адыгрываюць дзіцячыя СМІ? Пра ўсё гэта разважалі ўдзельнікі круглага стала «Дарослыя праблемы дзіцячага чытання», які арганізавала выдавецтва «Пачатковая школа».**

## МАРШАК НЕАКТУАЛЬНЫ

— Мода на кнігу, на жаль, прайшла. Але чаму толькі дзеці павінны чытаць? Чаму ўсе заклапочаны толькі гэтым пытаннем? Няўжо дарослыя ўжо ўсё прачыталі? Ці вы думаеце, што калі дарослыя не чытаюць, то дзеці возьмуць у рукі кнігу? — разважае **галоўны рэдактар псіхалагічнага і сацыяльна-педагагічнага часопіса «Дыялог», доктар псіхалагічных навук, прафесар Леанід ПЕРГАМЕНШЧЫК.** — А можа, нам толькі здаецца, што ў мінулым стагоддзі дзеці чыталі больш? Я задаю гэтыя пытанні, таму што ў мяне няма на іх дакладнага адказу. Ёсць гіпотэза, што чалавек, які чытае, будзе ў будучыні кіраваць чалавекам, які сёння глядзіць у экран свайго смартфона. Але ж усе кіраваць усё роўна не змогуць. Магу канстатаваць, што студэнты першага курса не ўмеюць складна гаварыць і перадаваць свае думкі, і гэта можа быць вынікам таго, што яны ў школьныя гады мала чыталі.

Усе мы бачылі рэкламу кшталту «навучым вас хутка чытаць», але, прабачце, навошта гэта рабіць? Калі ты чытаеш удумліва, то пазнаеш зразумець, якую інфармацыю да цябе хацелі данесці. А калі бегла?

Калі я прапаную сваім унукам кнігі, якія я сам чытаў у дзяцінстве, яны мяне не разумеюць. **Думаю, што мы, дарослыя, дрэнна ведаем сучасную дзіцячую літаратуру, таму спрабуем і далей выхоўваць юнае пакаленне на Маршаку. Між іншым, яна ёсць, і не менш цікавая за тую, што мы калісьці чыталі.** Спадзявацца, што любоў да чытання зможа прывіць школа, не варта, таму што там мастацкія творы звычайна «праходзяць». Канешне, ва ўсе часы былі таленавітыя педагогі, якія, нягледзячы на існаванне школьнай праграмы, маглі захапіць дзяцей працэсам чытання, але галоўнымі прапаведнікамі чытання павінны быць найперш бацькі. Калі яны чытаюць, то значна больш шанцаў, што будуць чытаць іх дзеці. Неабавязкова, але ў працэнтным выпадку шансы ўвогуле мінімальныя.

## ХУТКАСЦЬ АБО ЯКАСЦЬ?

— Сёння ідзе барацьба за ўвагу чытача. На многіх інтэрнэт-сайтах невыпадкова згадваецца, колькі часу зойме прачытанне таго ці іншага тэксту, — заўважае **кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ Таццяна КРАСНОВА.** — Шчыльнасць і аператыўнасць інфармацыі «зашкальваюць». Гэта раней тэкст меў пераважна лінейную структуру, а сёння мы маем справу з самымі рознымі відамі тэкстаў. І кліпавае мысленне ў падрастаючага пакалення — гэта рэакцыя на інфармацыйную празмернасць і паўсюдную візуалізацыю. Работа з тэкстам патрабуе намаганняў і пэўных навыкаў, напрыклад крытычнага мыслення.

**Што датычыцца хуткага чытання, то многія параўноўваюць яго з фастфудам — запіхнуць у сябе тоны літар, праглынуць, не жуючы, на хаду, у чарзе ці ў транспарце, і забыцца. А павольнае чытанне супрацьстаіць хуткаму спажыванню тэкстаў у сучаснай культуры: браўзінгу, вэб-сёрфінгу, слізгаценню па паверхні, нязадольнасці чытаць шмат літар, фрагментарнасці ўспрымання тэкстаў і гэтак далей.**

— Таму я абсалютна згодная з калегам: нам патрабуецца рэвізія павольнага чытання, якое спрыяе развіццю крытычнага мыслення — уменню пошуку і верыфікацыі інфармацыі, супастаўлення розных крыніц і канцэпцый, ацэнцы чужых меркаванняў і аргументаванай абароны ўласнай пазіцыі, — падкрэслівае Таццяна Краснова. — Між іншым, у некаторых замежных ВНУ ўжо нават уводзяцца курсы, на якіх студэнтаў навучаюць павольнаму чытанню. Ці можна было б укараніць такі курс у нас? Мяркую, што выкладаць яго зможа толькі вельмі мужны выкладчык, таму што з боку студэнтаў дакладна будзе супраціўленне. Вельмі цяжка пераканаць іх у тым, што гэта насамрэч важна...

Што датычыцца школьнікаў, то яны павінны ўмець вылучаць асноўныя думкі ў тэксце, умець пераказваць тэкст сваімі словамі, аперыраваць тэрмінамі, атрымаў у тэксце, а хуткае чытанне развіццю гэтых кампетэнцый зусім не спрыяе.

## ПАЙСЦІ ЗА ГЕРОЕМ

— Дзіця павінна чытаць павольна, крытычна, каб рабіць высновы, суперажываць герою і развівацца разам з ім, — падкрэслівае **начальнік упраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі, галоўны рэдактар часопіса «Выхаванне і дадатковая адукацыя», кандыдат педагагічных навук, дацэнт Наталля КАТОВІЧ.** — Трэба прызнаць, што сітуацыя з чытаннем змянілася не толькі ў нас, а ва ўсім свеце: яно становіцца больш элітарным і прагматычным, часцей выкарыстоўваецца для адукацыі і самаадукацыі. А вось у структуры баўлення вольнага часу яго доля скарацілася, чытаць проста для задавальнення сталі менш. Прычым прыярытэт аддаецца масаваму і забаўляльнаму чытанню, а кніга як крыніца інфармацыі знаходзіцца ў вельмі жорсткай канкурэнцыі з рознымі электроннымі носьбітамі. Зацікавіць дзяцей чытаннем дзеля задавальнення — найбольш складаная задача. Але педагог павінен навучыць іх творчаму, удумліваму, вобразнаму чытанню, каб у дзіцяці працавала фантазія, каб у дарослым жыцці чалавек мог знайсці адказы на складаныя жыццёвыя пытанні ў класічнай літаратуры або ў творах сучаснікаў.

**Даказана, што людзі, якія шмат чытаюць, здольны мысліць катэгорыямі, знаходзіць узаемасувязь паміж фактамі і падзеямі, адэкватна ацэньваць сітуацыю і хутчэй знаходзіць правільныя рашэнні. Яны маюць больш аб'ём памяці, актыўнае творчае ўяўленне. Іх мова больш выразная і багатая па сваім слоўнікавым запасе.**

## ЗНАЙСЦІ КЛЮЧЫК

— У мяне чацвёра дзяцей, яны ўсе ўжо амаль выраслі. Прызнаюся, калісьці я была ўпэўненая ў тым, што калі ў доме шмат кніг, а маці і бацька чытаюць, то і дзеці будуць захоплены гэтым працэсам. Але агульны культурны фон і наша рэчаіснасць уносяць свае карэктывы, — заўважае **дырэктар, галоўны рэдактар выдавецтва «Пачатковая школа» Вольга ВАНІНА.** — Мае дзеці чытаюць розную па тэматыцы літаратуру, і іх цікавяць розныя часопісы. Галоўнае — падабраць да кожнага дзіцяці ключык, і наша выдавецтва забяспечвае багаты выбар такіх інструментаў.

15 гадоў прайшло з моманту выхаду першага часопіса «Рукзачок». За гэты час у выдавецтве з'явілася 13 часопісаў, разлічаных на дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 2 да 18 гадоў. У часопісах для самых маленькіх увогуле няма тэкстаў, але яны ўжо вучаць працаваць з інфармацыяй і развіваюць важныя кампетэнцыі. Чаму менавіта часопіс можа аказацца найбольш эфектыўным інструментам для заахвочвання чытаннем дзяцей? У кнігах тэксты больш доўгія, а часопіс дае магчымасць выбраць кароценькія. Мы робім стаўку на гіпертэкставасць, штосьці выносім на палі, каб разгрузіць асноўны тэкст, дробім яго на маленькія кавалачкі з падзагалоўкамі. Разнастайная форма падачы дазваляе дзіцяці працей увайсці ў матэрыял. У нашых часопісах ёсць і налепкі, і дапоўненая рэальнасць, і мультымедыйныя дыскі. Дзіця ўспрымае ўсё праз эмоцыі, і сухі інфармацыйны тэкст проста не будзе ім прачытаны. Увесь матэрыял падаецца з улікам псіхалагічных асаблівасцяў развіцця дзіцяці. Мы не ўпускаем з віду, што часопісы набываюць і выпісваюць бацькі, думаем, як зможа выкарыстаць іх на сваіх занятках педагог.

## ФЭНТЭЗІ НАСТУПАЕ

**Вольга БАНДАРЧУК, загадчык сектара сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,** канстатуе: — Праблемы дзіцячага чытання хвалююць не толькі педагагічную супольнасць, але і нас. Нацыянальная бібліятэка як метадычны цэнтр усіх 2,5 тысяч публічных бібліятэк вядзе актыўную даследчую работу ў гэтым кірунку. У 2009—2010 гадах было праведзена маштабнае рэспубліканскае даследаванне «Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь». А летась — даследаванне «Попыт на выданні сучасных беларускіх аўтараў у структуры інфармацыйных патрэб». Адной з яго задач было правесці маніторынг стану дзіцячага чытання, каб можна было параўнаць, што змянілася за час, які прайшоў. Усяго ў даследаванні прынялі ўдзел 2,7 тысячы чалавек: 1300 дзяцей і 1400 падлеткаў. Канешне, ананімнае апытанне мае трохі суб'ектыўны характар, тым не менш мы атрымалі шмат цікавай інфармацыі для роздуму. У структуры баўлення вольнага часу чытанне кніг, газет і часопісаў займае ў падрастаючага пакалення трэцюю пазіцыю. Моўныя перавагі амаль не змяніліся: 82 працэнты дзяцей ва ўзросце ад 7 да 10 гадоў чытаюць на рускай мове, а ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў іх доля дасягае 85,5 працэнта.

Топ-10 любімых кніг для дзяцей 7—10 гадоў узначальвала летась кніга «Пэпі Доўгая панчоха», серыя кніг пра Нязнайку, казкі, кнігі пра Гары Потэра, энцыклапедыі і «Дзяніскавы апавяданні» Віктара Драгунскага... У 2009 годзе на піку папулярнасці былі казачная аповесць Эдуарда Успенскага «Дзядзька Фёдар, сабака і кот», казкі, «Дзяніскавы апавяданні», серыя пра Нязнайку, «Гары Потэр» і энцыклапедыі. Як бачна, мала што змянілася. У дзяцей у тройку жанрава-тэматычных пераваг уваходзяць прыгоды, казкі, літаратура пра прыроду і жывёл, а ў падлеткаў — прыгоды, фантастыка і дэтэктывы, але ўсё часцей у перавагі трапляюць фэнтэзі і містыка.

**У Топ-3 любімых кніг падлеткаў ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў увайшлі летась «Гары Потэр» (8,3 %), «Маленькі прынц» (2,8 %) і серыя раманаў «Змярканне» (1,7 %). Цікава, што дзесяць гадоў таму падлеткі таксама захапляліся «Гары Потэрам» і «Змярканнем». Увогуле апытаныя згадалі каля 600 назваў любімых кніг.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

## БЕЛАРУСКІ ШОРТ-ЛІСТ

Любімыя беларускія аўтары ў дзяцей 7—10 гадоў — Якуб Колас (19,9 %), Янка Купала (10,6 %), Уладзімір Ліпскі (4,4 %), Янка Маўр (4,4 %), Міхась Лынькоў, Васіль Вітка, Павел Місько, Раіса Баравікова, Рыгор Барадулін і Артур Вольскі. Падлеткі найбольш часта ў якасці любімых пісьменнікаў згадваюць Уладзіміра Караткевіча, Янку Маўра, Васіля Быкава, Купалу, Коласа, Івана Мележа, Андрэя Федарэнку, Івана Шамякіна, Міхася Лынькова і Яўгена Хвалея. Любімыя кнігі і творы — «Дзікае паляванне караля Стаха», «Палескія рабінзоны», «Людзі на балоце», «Жураўліны крык», «Міколка-паравоз», «Насцечка», «На ростанях», «Прынцэса з тусоўкі», «Ніколі не забудзем», «Казкі астранаўта». Малодшыя школьнікі згадалі падчас апытання 230 найменняў беларускіх кніг і 86 беларускіх аўтараў, падлеткі — 122 кнігі і 74 аўтараў.

— Адказы дзяцей вельмі цікавыя, але на іх, несумненна, моцна ўплывае школьная праграма па літаратуры. А вось што сказалі нашы эксперты, у ролі якіх выступілі бібліятэкары. Пасля аналізу кнігавыдач у 2018 годзе склалася наступная карціна, — расказвае Вольга Бандарчук. — Найбольш часта ў бібліятэках летась прасілі выдаць кнігі Раісы Баравіковай, Алены Масла, Уладзіміра Ягоўдзіка, Генадзя Аўласенкі, Уладзіміра Караткевіча, Валерыя Гапеева, Паўла Місько, Уладзіміра Ліпскага, Васіля Быкава, Андрэя Жвалеўскага і Яўгеніі Пастарнак. Самымі папулярнымі творамі сталі «Казкі астранаўта» Раісы Баравіковай, «Прыгоды Бульбобаў» Паўла Місько, «Афганская шкатулка» Андрэя Федарэнкі, «Час заўсёды добры» Андрэя Жвалеўскага і Яўгеніі Пастарнак, «Міколка-паравоз» Міхася Лынькова, «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра, «Адзінокі васьмікласнік жадае пазнаёміцца» Алеся Бадака, «Альпійская балада» Васіля Быкава і іншыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Трэці працоўны

# «Дзеці Нёмана» ў Анапе,

## або Найлепшыя на выездзе

**Педагагічны атрад з Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы з такой назвай стаў летась найлепшым выязным атрадам па выніках рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр». Гэта было адзначана на Усебеларускім злёце студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Рамантыка». Камандзір атрада, трэцякурсніца Анастасія ПРАТАСАВІЦКАЯ расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене», ці кожны можа стаць яго членам, а таксама пра тое, як гэта — працаваць побач з Чорным морам...**





У педагагічным атрадзе «Дзеці Нёмана» дзяўчына трэці год. Як толькі паступіла ва ўніверсітэт, вырашыла заняць вольны час карыснай справай. Пра тое, што ёсць такі кірунак занятасці, яна ведала, бо сама з'яўляецца старшынёй пярвічкі БРСМ на сваім факультэце.

— «Дзеці Нёмана» аб'ядноўваюць два атрады: педагагічны (важатыя) і сэрвісны (афіцыянты). Бяруць туды ўсіх ахвотных, але перад тым, як паехаць працаваць за мяжу, трэба прайсці навучанне. На базе ўніверсітэта ёсць школа важацкага майстэрства, дзе заняткі доўжацца адзін семестр. Калі ставіцца да іх несур'ёзна і прапускаць — пазбаўляешся магчымасці трапіць у склад выязной групы, — расказвае Анастасія.

Дзяўчаты і хлопцы са студатрада выязджаюць на работу ў Анапу ўжо шосты год — у санаторна-аздараўленчы комплекс «Жамчужына Расіі». Фарміруецца два заезды: з 1 чэрвеня да 15 ліпеня і з 15 ліпеня да 31 жніўня. Такім чынам, адпрацоўваецца дзве дзіцячыя лагерныя змены. Камандзіры атрадаў кожны год мяняюцца, выбіраюць больш вопытных і адказных, тых, хто праяўляе найбольшую актыўнасць у студэнцкім жыцці.

— На кожны працоўны семестр набіраецца 30—40 чалавек у адзін атрад. Я паспела паспрабаваць свае сілы як у педагагічным, так і ў сэрвісным. Самае крутое, што дзяўчаты і хлопцы самі выбіраюць, дзе ім працаваць, часта прыходзяць кампаніямі, каб было весялей, — кажа суразмоўніца.

Студэнты ўступаюць у студатрад па розных прычынах. Адны хочуць атрымаць уражанні і вопыт, другія — прайсці практыку, сумяшчаючы яе з адпачынкам, трэція — каб зарабіць грошы. Некаторыя настолькі любяць пэўны санаторый, што раней за ўсіх пішуць заяву, пажаданне (куды б хацелі трапіць), браніруюць месца і чакаюць станоўчага адказу.

— Галоўнае ў нашай рабоце — гэта эмоцыі: ад дзяцей, з якімі працуеш, ад прыгажосці, што бачыш кожны дзень. Цікава, што падчас паездак нехта з нас знаходзіць не толькі сяброў, але і каханне, — працягвае Анастасія. — Увогуле мы разам ездзім на розныя злёты студатрадаў, збіраемся ў вольны час на прыродзе, дзе спяваем песні пад гітару. Не адмаўляемся і ад сустрэч са старымі сябрамі з іншых краін.

Мы пагаварылі не толькі з капітанам педагагічнага атрада, але і з іншымі членамі «Дзяцей Нёмана». Вось што яны расказалі пра свой вопыт работы за мяжой.

**Дзмітрый ІЗВЕКАЎ, выпускнік фізіка-тэхнічнага факультэта:**

— У складзе педагагічнага атрада працую два гады. Даведаўся ад знаёмых, што можна не толькі добра зарабіць грошай летам, але і крута адпачыць. Мой першы вопыт у дзіцячым санаторыі «Жамчужына Расіі» быў у якасці ратавальніка, у другі раз працаваў афіцыянтам. Спачатку было складана, мы хутка стамляліся, але праз тыдзень штодзённай практыкі ўсё стала на свае месцы. Тым больш прыгажосць, якая нас цешыла пасля работы, давала моцную энергію. Цяпер я на апошнім курсе ўніверсітэта, і ў мяне апошняя магчымасць пабыць у складзе студатрада. Упэўнены, што гэта будзе крута!

**Мікіта ГУРА, выпускнік юрыдычнага факультэта:**

— У «Дзецях Нёмана» я другі год. Даведаўся ад старасты групы і адразу вырашыў — паеду. У Анапе быў важатым і харэографам-пастаноўшчыкам. Выхадных не было, нават калі з'яўлялася вольная хвіліна — не сядзеў склаўшы рукі, а ішоў дапамагаць іншым. Для мяне важныя вопыт і заробак — я атрымліваю іх у педагагічным атрадзе. Спадзяюся, што такая магчымасць з'явіцца ў мяне не апошні раз.

**Ганна ШЧУКА, III курс, філалагічны факультэт:**

— Даведалася пра гэты студатрад яшчэ перад паступленнем ва ўніверсітэт. Калі пачула, што работа за мяжой, побач з морам, узнікла вялікае жаданне туды паехаць. Дзякуючы таму, што я актыўна праяўляла сябе ў жыцці ВНУ, была актывісткай БРСМ, мне прапанавалі стаць камісарам атрада. Такім чынам працую ў складзе сэрвіснага атрада ўжо два гады. Такі від занятасці не лічу цяжкім, працоўны семестр — гэта маленькае жыццё. Новыя знаёмствы (з многімі дзяўчатамі і хлопцамі з іншых краін мы сустракаемся і дагэтуль), пачуццё адказнасці за іншых людзей... Дзякуючы атрыманаму вопыту цяпер магу хутка знаходзіць выхад з любых сітуацый. Акрамя таго, члены студатрада — вялікая сям'я, і калі камусьці патрэбна дапамога ці падтрымка, мы можам разлічваць адно на аднаго.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Лакацыі актыўнасці

# Дзе студэнтам можна «рукі прыкласці»?

**Сёлета ўрачыстая цырымонія рэспубліканскага адкрыцця трэцяга працоўнага семестра з удзелам больш чым 400 байцоў, камандзіраў, камісараў студэнцкіх атрадаў з розных рэгіёнаў краіны прайшла на тэрыторыі Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». У гэтым годзе ён прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цэнтральнае месца ў мерапрыемстве было адведзена акцыі «Беларусь памятае»: удзельнікі трымалі ў руках больш за 200 партрэтаў Герояў Савецкага Саюза часоў Вялікай Айчыннай вайны і герояў-камсамольцаў, ураджэнцаў Беларусі. Пасля байцы заняліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, а таксама сімвалічна высадзілі 75 елак.**



Цырымонія ўручэння працоўных пуцёвак студэнцкім атрадам сталіцы і ўзняцце сцяга Мінскага гарадскога штаба студэнцкіх атрадаў (МГШСА) сёлета ўпершыню адбыліся на будаўнічай пляцоўцы станцыі «Юбілейная плошча» Мінскага метрапалітэна.

Месца для правядзення мерапрыемства, у якім бралі ўдзел больш за 250 байцоў, камандзіраў, камісараў студэнцкіх атрадаў з розных раёнаў сталіцы, было абрана невыпадкова. Будаўніцтва трэцяй лініі мінскага метро абвешчана гарадской маладзёжнай будоўляй. Такое рашэнне прыняў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

Сёлета МГШСА арганізуе на маладзёжнай будоўлі працу зводнага беларуска-расійскага студэнцкага атрада агульнай колькасцю 120 байцоў, якія будуць выконваць розныя віды работ: земляныя і бетонныя, паднос арматуры і іншыя.

Усімі структурамі МГШСА ўжо заключана больш за 120 дагавораў на працаўладкаванне дзвюх тысяч чалавек. Аб'ектамі для работы студэнцкіх атрадаў стануць найбуйнейшыя прадпрыемствы: БелАЭС, УП «Мінскметрабуд», КУП «Бізнес-цэнтр «Сталіца», ААТ «Атлант», УП «Зелянбуд», ДВА «Мінскбуд», ААТ «ДарОрс», КУП «Мінскхлебпрам», ТАА «Еўрагандаль», ААТ «МТЗ», КУП «Мінсктранс», РУП «Белтэлекам», УП «Мінскводаканал», ААТ «Амкадор» і іншыя.

Акрамя таго, у Мінску сфарміравана дзесяць студэнцкіх сэрвісных атрадаў з 300 байцоў з ліку студэнтаў БНТУ, БДУ, МДЛУ і Мінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання, якія працуюць на II Еўрапейскіх гульнях у сталіцы. Яны аказваюць садзеянне ў арганізацыі харчавання гасцей і ўдзельнікаў Гульняў.

А, скажам, у Мінскай вобласці сёлета падчас трэцяга працоўнага семестра запланавана работа 138 студэнцкіх атрадаў (больш за тры тысячы чалавек) рознага профілю. Напрыклад, у Капыльскім раёне — вытворчага студэнцкага атрада па пашыве пасцельнай бялізны ў мясцовым дзяржаўным каледжы. У Пухавіцкім байцам студэнцкага вытворчага атрада даверац зборку вырабаў з пластмас у зборачным цэху ААТ «Рудзенск». У Валожынскім раёне ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Палачанка» ў студэнцкім педагагічным атрадзе будуць працаваць 42 чалавекі, а ў філіяле «Аздараўленчы комплекс «Спадарожнік» ААТ «Мінскрамбуд» — каля 100 чалавек. Арганізацыя студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў запланавана практычна ва ўсіх рэгіёнах Міншчыны. Самыя шматлікія з іх — у Клецкім, Мінскім і Чэрвеньскім раёнах. Студэнцкія атрады экалагічнага профілю створаць у Бярэзінскім, Вілейскім, Дзяржынскім, Крупскім, Лагойскім, Любанскім, Мядзельскім, Смалявіцкім, Салігорскім, Стаўбцоўскім, Уздзенскім, Чэрвеньскім раёнах і Жодзіне. Студатрады будаўнічага профілю чакаюць у Барысаўскім, Любанскім, Маладзечанскім, Смалявіцкім раёнах. Так, моладзь Смалявіцкага раёна будзе працаваць адразу на двух аб'ектах рэгіёна: на падсобных работах у філіяле КУП «Мінскаблдарбуд» — «Дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 123» і ў ААТ «Перасоўная механізаваная калона № 72». Медыцынскі студатрад плануецца арганізаваць у Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Падчас правядзення прома-акцыі БРСМ «Выбіраем студатрад!» толькі з сакавіка да мая заяўкі на працаўладкаванне ў складзе студэнцкіх атрадаў падалі каля дзвюх з паловай тысяч прадстаўнікоў моладзі Міншчыны.

Статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі прысвоены сёлета Указам Прэзідэнта аб'ектам сацыяльнай інфраструктуры, якія ўзводзяцца ў Астраўцы. Цяпер там шырока вядзецца жыллёвае будаўніцтва. Згодна з прагнозамі, да 2020 года колькасць насельніцтва горада вырасце з 10 да 22—23 тысяч чалавек, што звязана са з'яўленнем БелАЭС. У Астраўцы запланавана ўзвядзенне шматфункцыянальнага спартыўнага комплексу, крытай лядовай пляцоўкі, школы, бальніцы, дзіцячага сада, аўтавакзала. Да будаўніцтва аб'ектаў маркуецца прыцягваць не толькі студэнцкія атрады, але і маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года, якія пажадаюць займацца ў горадзе працоўнай дзейнасцю. Увогуле за апошнія пяць гадоў на аб'ектах БелАЭС папрацавалі больш за дзве тысячы байцоў з беларускіх і расійскіх атрадаў.

Нагадаем, што 2019 год аб'яўлены БРСМ Годам студэнцкіх атрадаў. Так што не ўпусціце свой шанц!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Ідэі маладых*

# ЯК ДАПАМАГЧЫ... ШКОЛЬНАМУ ПСІХОЛАГУ

**Зараз спецыялісты перыядычна праводзяць з дзецьмі розныя тэсціраванні. Часцей за ўсё звесткі збіраюцца ўручную, і вынікаў хутка не дачакаешся. Пасля аднаго з такіх чарговых выпрабаванняў дзве дзевяцікласніцы (цяпер ужо выпускніцы) Пліскай сярэдняй школы імя Уладзіміра Мікуліча з пасёлка Акцябрскі Смалявіцкага раёна Вікторыя ЮРКЕВІЧ і Вікторыя РАГОЖЫНА вырашылі стварыць нешта такое, што дапамагло б школьнаму псіхолагу палегчыць яго работу. Што з гэтага атрымалася ў дзяўчат?**



Вікторыя Рагожына і Вікторыя Юркевіч *(злева направа).*

— Ідэя праекта «Прапсіхолаг» прыйшла два гады таму, — кажа Вікторыя Юркевіч. — Мы падумалі: чаму б не стварыць аўтаматызаваную праграму? Са сваёй ідэяй пайшлі да нашага настаўніка па фізіцы і інфарматыцы, ён патлумачыў, як працаваць з базавымі складнікамі. А псіхолаг дапамагла з патрэбнай літаратурай.

— На распрацоўку першай праграмы ў нас пайшоў месяц, у выніку адказы ўсяго класа можна было апрацаваць максімум за гадзіну. Такім чынам, замест таго каб доўга сядзець над паперамі, псіхолаг атрымлівае больш часу для размовы са школьнікамі, — дзеліцца Вікторыя Рагожына.

Спачатку вучаніцы са сваім кіраўніком размяшчалі гатовыя варыянты тэсціраванняў у папулярных суполках сацсеткі «УКантакце» («Меню школьнага псіхолага», «Дзіцячы школьны псіхолаг»), каб пагладзець, ці гэта запатрабавана. Неўзабаве стала зразумела — адваротная сувязь ёсць: паступала шмат каментарыяў, удзячнасцяў і просьбаў дапамагчы з тэстамі. Таму вынаходніцы вырашылі развіваць свой праект далей: стварылі ўласны курс на сайце Eschool.by.

— Віка адказвае за знаходжанне тэстаў, якія цяпер запатрабаваныя сярод псіхолагаў, а я — за іх трансфармацыю ў электронны варыянт і размяшчэнне на сайце. З-за таго, што ў нас паступала шмат заказаў, праца ішла бесперапынна, — расказвае Віка Рагожкіна.

Кіраўнік праекта Аляксандр РУБАНАЎ тлумачыць, што вынікі, якія атрымліваюць пасля праходжання тэстаў, нельга інтэрпрэтаваць без спецыяльнай адукацыі. Усе сістэмы і распрацоўкі зацверджаны Міністэрствам адукацыі і актыўна выкарыстоўваюцца ў школах.

— Аналагі нашых тэсціраванняў ёсць у інтэрнэце, але не ўсе яны падыходзяць пад кожны клас, патрэбную ўзроставую катэгорыю. Таму мы адаптуем свае тэсты пад умовы і пажаданні кліентаў, з кожным заказам робім праграму больш камфортнай у выкарыстанні. У нас ёсць тэсты па прафарыентацыі, эмацыйным выгаранні і іншыя — методык шмат, ад простых да складаных. На распрацоўку самага складанага тэсціравання сышло каля паўгода. Дарэчы, заказчыкі ў нас — не толькі з Беларусі, але і з краін бліжняга замежжа, — расказвае Аляксандр.

Праект «Прапсіхолаг» дзяўчаты ўжо прадстаўлялі на «Хакатоне», конкурсе стартапаў «ICT sturtup Belarus 2019», рэспубліканскім маладзёжным конкурсе «100 ідэй для Беларусі», навукова-тэхнічным конкурсе «Тэхнаінтэлект», дзе бачылі зацікаўленую рэакцыю аўдыторыі і атрымлівалі прызавыя месцы ад журы. Стваральнікі праграмы лічаць яе сацыяльным праектам, але ў далейшым плануюць яе камерцыялізаваць, каб пашырыць каманду і стварыць уласны дадатак для тэлефона.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Добрыя сэрцам*

# БЯЗДОМНЫМ ЖЫВЁЛАМ — ЦЁПЛЫЯ ХАТКІ

**У жодзінскай сярэдняй школе № 5 вельмі любяць прыроду, таму часта ўдзельнічаюць у розных экалагічных праектах. Летась там вырашылі заняцца праблемай бадзяжных жывёл. З ініцыятывай па стварэнні для іх «Цёплых хатак» вучні на чале з настаўніцай біялогіі Людмілай Паўлавец звярнуліся ў жыллёва-камунальную гаспадарку і да ўладаў горада. З праектам дайшлі і да рэспубліканскага этапу конкурсу «100 ідэй для Беларусі», які ладзіцца Саюзам моладзі.**



Адна з удзельніц праекта Паліна Нітчанка і настаўніца біялогіі Людміла Паўлавец.

«Колькасць кінутых жывёл павялічваецца з ростам насельніцтва. Яны часта гінуць, што выклікае яшчэ і санітарную небяспеку для людзей», — акрэсліваюць праблему жодзінскія школьнікі. Разам з настаўніцай вучні пачалі шукаць гуманныя спосабы дапамогі братам нашым меншым. «Хлопцы і дзяўчаты, убачыўшы статыстыку адлову катоў і сабак, якую нам прадставілі ў ЖКГ, былі вельмі ўзрушаныя, — кажа кіраўніца праекта. — Таму нарадзілася ідэя стварыць экалагічныя «Цёплыя хаткі». Апытанне мясцовых жыхароў паказала, што ў горадзе шмат аднадумцаў. Гэта надавала сілы для далейшых дзеянняў.

Перш-наперш валанцёры ўмоўна падзялілі Жодзіна на некалькі дзясяткаў квадратаў, дадалі пару ўчасткаў каля горада і на працягу чатырох месяцаў лічылі бяздомных жывёл. Пасля стварылі інтэрактыўную карту, на якой адзначылі месцы з іх максімальнай колькасцю, дзе хаткі патрабуюцца больш за ўсё.

Далей пачалі распрацоўваць іх макеты. Вырашылі, што трэба рабіць домікі з адходаў, якія ўтвараюцца на пілараме, тады яны будуць танныя. Былі ўлічаны і кліматычныя ўмовы: зімой холадна, значыць, неабходна ўцяпліць падлогу і сцены пенапластам.

Адзін такі экадамок, на думку валанцёраў, зможа ўмясціць два-тры сабакі альбо сям'ю кошак з трыма-чатырма кацянятамі. Яго сярэдні кошт (з улікам матэрыялу) атрымаецца каля 125—195 рублёў.

Каб пазбегнуць вандалізму, хаткі вырашылі размяшчаць каля пад'ездаў, якія маюць сістэму відэаназірання. Паклапаціліся юныя распрацоўшчыкі і пра эстэтычны складнік. Дамок спраектаваны такім чынам, каб не парушыць агульную канцэпцыю забудовы горада і каб яго можна было гарманічна ўпісаць у навакольную прастору.

— Мы атрымалі адабрэнне і згоду на бясплатную стэрылізацыю і часовае ўтрыманне жывёл падчас рэабілітацыі ад ветэрынарных клінік. Ініцыятыву ўхвалiў і намеснік дырэктара жыллёва-камунальнай гаспадаркі нашага горада. Усе гатовыя дапамагчы. Засталося толькі ажыццявіць задуманае, — кажа Людміла Паўлавец.

Адметна, што падобны праект «Цёплыя хаткі для катоў» ужо рэалізавала міжнародная зоаабаронча арганізацыя Animal Care Center «LISABONA» ў Кобрыне. Дзякуючы старшыні райвыканкама і дырэктару ЖКГ яны паставілі пяць домікаў, зробленых з еўраваганкі.

— Калі ёсць жаданне працаваць і змяняць свет да лепшага, то ўсё абавязкова атрымаецца, — адзначаюць у арганізацыі. — Спачатку было шмат скептыкаў, гучалі меркаванні, што кіраўніцтва горада не дазволіць устанавіць гэтыя домікі, што гараджане знішчаць іх у першую ж ноч. Але, як мы бачым, улады вельмі пазітыўна паставіліся да праекта, а жыхары падкормліваюць катоў і берагуць іх жыллё.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

# КІЛАМЕТРЫ ПАМЯЦІ, ТВАРЫ ПЕРАМОГІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Нагадаем, маладзёжную ініцыятыву па з'яўленні такога альбома падчас сёлетняга ўрачыстага мерапрыемства 9 мая каля манумента Перамогі ў Мінску падтрымаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. На яго старонках будуць размешчаны фотаздымкі воінаў-вызваліцеляў, партызан, падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу — усіх тых, хто абараняў і вызваляў краіну ад захопнікаў. Зрабіць свой унёсак у стварэнне альбома «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі» мог любы жыхар краіны. Для гэтага неабходна было даслаць фатаграфіі і кароткія гісторыі сваіх сваякоў, якія бралі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. З сабраных здымкаў частка будзе размешчана на 75 аркушах у самім альбоме, а абсалютна ўвесь унікальны матэрыял увойдзе ўжо ў мультымедыйны зборнік.



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Таксама ў ім будуць фатаграфіі актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і прафсаюзаў Беларусі, вядомых навукоўцаў, спартсменаў, дзеячаў культуры, прадстаўнікоў Узброеных Сіл, органаў і падраздзяленняў унутраных спраў, аддзелаў па надзвычайных сітуацыях, вядомых палітыкаў, журналістаў, творчай інтэлігенцыі, стыпендыятаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з партрэтамі іх дзядоў і прадзедаў з пакалення пераможцаў.

Стварэнню палотнішча «Беларусь памятае!» папярэднічала пошукава-даследчая работа. Актывісты Саюза моладзі ва ўсёй краіне вывучалі і абагульнялі інфармацыю пра Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Затым стварылі ў колерах нацыянальнага сцяга Рэспублікі Беларусь рэгіянальныя палотнішчы «Беларусь памятае!», якія складаюцца з лапікаў тканіны чырвонага і зялёнага колераў з нанесенымі імёнамі Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы і іншай інфармацыяй: гады жыцця, воінскае званне, населены пункт, у якім нарадзіўся воін.



Пры наведванні раёнаў і гарадоў рэгіянальныя палотнішчы перадаваліся ўдзельнікам маладзёжнага марафона. Іх плануецца ператварыць у рэспубліканскае з надпісам «1941 Беларусь памятае 1945» памерам 6 на 12 метраў, якое будзе складацца з 478 кавалачкаў (239 чырвоных і 239 зялёных).

19 чэрвеня патрыятычны праект «Маладзёжны марафон «75» завяршыў свой асноўны шлях па месцах баявой славы Беларусі каля аднаго з самых вядомых сімвалаў Перамогі — Кургана Славы. Пад гукі аркестра Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС да яго падножжа была ўскладзена гірлянда памяці, вянкі і кветкі. Потым моладзь Смалявічыны прэзентавала абласное «Палотнішча Перамогі» з 88 фрагментаў з інфармацыяй пра ўраджэнцаў цэнтральнага рэгіёна — Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы.

Тут жа, пад адкрытым небам, на імправізаванай сцэне разгарнулася святочная канцэртная праграма ад марафонцаў і творчых калектываў Міншчыны, якую дапоўніла работа інтэрактыўных пляцовак оўпэн-эйра «Кветкі Вялікай Перамогі»: «Прывал», «Палявая кухня» з кашай і гарбатай, «Ваенны лагер» з удзелам выхаванцаў Цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі «Вектар» (Жодзіна), караоке «Песні ваенных гадоў» і іншых. Цікавасць выклікала пляцоўка «Музей у чамадане», прадстаўленая чатырма школьнымі музеямі Вялікай Айчыннай вайны Смалявіцкага раёна, — са сваімі гісторыямі і ваеннымі рарытэтамі. Тут жа можна было пазнаёміцца з работай службовых сабак падчас паказальнага выступлення кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Плануецца, што створанае палотнішча актывісты Саюза моладзі пранясуць 3 ліпеня ў Мінску падчас патрыятычнага шэсця «Беларусь памятае». Затым яно, як і альбом «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі», будзе перададзена на захоўванне ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*размеркаванне*

# РАБОЧЫ ДЗЕНЬ — ЯК СВЯТА

**Штогод у гарады і вёскі на работу прыязджаюць дзясяткі маладых хлопцаў і дзяўчат. Калектывы папаўняюцца навaспечанымі ўрачамі, юрыстамі, метадыстамі ды спецыялістамі іншых профіляў. Чэрвеньскі раённы цэнтр культуры і адпачынку пазалетась не стаў выключэннем: тут з'явілася яркая, рознабаковая, крэатыўная моладзь.**

Любоў ЕЛСУКОВА і Антон НЯДЗВЕДЗЬ на Чэрвеньшчыну трапілі з мінскага каледжа імя Міхаіла Глінкі. «Насамрэч у мяне было два варыянты: Чэрвень і Клецк, — расказвае Люба. — Але я так перапалохалася, што забылася, які другі горад. Атрымалася добра: з Мінска ездзіць бліжэй». Аднак Антон не так радуецца: на маршрутку штомесячна сыходзіць палова зарплаты. Чаму б не жыць у Чэрвені? Вірлівае жыццё сталіцы прываблівае больш. Хлопец там займаецца танцамі (ліндзі-хопам), ходзіць на канцэрты, тусуецца з сябрамі — часта да дзвюх-трох ночы. А ранкам выязджае на працу. Адсыпацца даводзіцца на выхадных...

У Любові звычайны працоўны дзень пачынаецца са змагання са сном: «Наліваю каву, уключаю камп'ютар, запаўняю журнал. Пасля абеду прыходзяць займацца школьнікі. З імі мы распяваемся, працуем над голасам, вучым песні. А ўвечары — заняткі з дарослым калектывам «Вербніца»: разбіраем мелодыю, ставім танцы».



Любоў Елсукова.

У работу Люба ўлілася лёгка, бо яшчэ падчас вучобы займалася рэпетытарствам, наладжвала кантакт з дзецьмі. З імі ў дзяўчыны асаблівыя адносіны: «Я, можна сказаць, выглядаю як школьніца, — апісвае



Валянціна Задзірава.

сябе выкладчыца. — Дзеці, канешне ж, успрымаюць мяне як педагога. Але нам прасцей быць на адной хвалі, таму што мы падобныя знешне». Метад выкладання ў Любові ўжо таксама ёсць: не строга, а з гумарам! Лічыць, што тлумачыць памылкі трэба так, каб ніхто не пакрыўдзіўся і ў той жа час усё зразумеў... З калегамі ёй таксама прыемна стасавацца. Паміж сабой яны дзеляцца досведам: дзяўчына прапаноўвае падцягнуць вакал, а хтосьці, напрыклад, вучыць іграць на гітары...

Праца з дзецьмі, падрыхтоўка да мерапрыемстваў напружвае і стамляе. На сябе часу амаль не застаецца. Мама Любы, якая параіла ёй паступаць у музычны каледж, цяпер кажа: «Навошта адправіла цябе туды, што гэта за пекла такое?!» Але дзяўчына не шкадуе. «Паступова прызвы-



Антон Нядзведзь.

чайваешся да працы і разумееш: табе падабаецца, — робіць для сябе выснову Любоў. — Вынік відавочны — і ты шчаслівая ад гэтага. Тады забываешся пра нервы і недасыпы».

